Будущее всего мира в руках подрастающего поколения, и поэтому так важно просвещать детей о всевозможных проблемах, возникающих в обществе. И посредствам телевидения это сделать проще и эффективнее.

Из всего этого можно сделать один, аргументированный вывод: «Дисней» – потрясающий источник знаний о мире для детей и подростков, контент которого является простым для восприятия, а также не менее интересным для просмотра.

1. Брайант, Дженнингз, Томпсон, Сузан.— Основы воздействия СМИ.: Пер. с англ. — М.: Издательский дом «Вильямс», 2004. — 432 с.: ил. — Парал. тит. англ.

2. https://ru.wikipedia.org/wiki/Disney_Channel

**Ждан Н.А.,**студ.319 гр.
Навуковы кіраўнік – Войцік С.Ф.

## МЕТАДЫ РАБОТЫ З ДЗІЦЯЧЫМ ФАЛЬКЛОРНЫМ АНСАМБЛЕМ

Ужо 2 гады я з'яўляюся кіраўнікам дзіцячага фальклорнага ансамбля «Сенічка», які працуе на базе Сеніцкага цэнтра культуры. У склад ансамбля ўваходзіць 15 чалавек, якія пражываюць у а/г Сеніца, Прылукі, пасёлку Юбілейны. Дзіцячы аматарскі калектыўпрадугледжвае заняткі на добраахвотнай аснове.

Фальклорны ансамбль – сінтэзаванае мастацтва, якое ўключае ў сябе песню, танец, народную гульню, інструментальную музыку, пантаміму, дэкламацыю і накіравана на развіццё творчых і музычных здольнасцяў, а таксамаадукацыйнага ўзроўню дзяцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кіраўнік ансамбля фарміруе ўсю арганізацыйную і творчую дзейнасць калектыву, арганізоўвае вучэбна-творчы працэс, займаецца выхаваннем пеўчага, харэаграфічнага і акцёрскага майстэрства, а таксама выяўляе індывідуальныя творчыя здольнасці кожнага выканаўцы. Поспех калектыву залежыць у першую чаргу ад зацікаўленасці саміх удзельнікаў, а таксама ад энтузіязма і творчай індывідуальнасці самога кіраўніка. У сувязі з гэтым неабходны пушук новых, цікавых метадаўработы.

Слова метад (ад грэч. Metodos – шлях да чаго-небудзь, спосаб дасягнення мэты).

Важным момантам пры засваенні фальклорнага матэрыялу з'яўляецца выбар метадаў, якія спрыяюць актывізацыі вучняў на занятках, фарміраванню эстэтычных пачуццяў,узбагачаюць светапогляд дзяцей.

У педагагічнай тэорыі і практыцы да такіх метадаў адносяць:

*1. Тлумачальна-ілюстратыўны метад.*

Сюды уваходзяць: аповяд, гутарка, метад вуснага тлумачэння, метад паказу (выконвае сам педагог), праслухоўванне аудыёматэрыялаў, дэмантрацыя відэаматэрыялаў.

Гэты метад забяспечвае перадачу ведаў і заключаецца ў тым, каб як мага лепш прыцягнуць увагу дзяцей да тэмы, якая абмяркоўваецца. На занятках дзеці праслухоўваюць аудыёматэрыялы з запісамі народных песен, праглядаюць відэаматэрыялы з канцэртных праграм і абрадавых пастановак народных і ўзорных фальклорных калектываў, а пасля гэтага ідзе абмеркаванне таго, што яны пачулі і ўбачылі.

Любы фальклорны ансамбль акрамя вакальнай і танцавальнай групы мае групу інструментальнага суправаджэння. Асаблівую цікавасць для дзяцей ўяўляюць шумавыя і духавыя інструменты: калатушкі, лыжкі, звоночкі, талеркі, бразготкі, бубен, барабан, дудка, пішчалка, жужалка, гармонік, акарына, жалейка. Настаўнік для знамства з імі прыносіць на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заняткі фотаздымкі, а яшчэ лепш – самі інструменты, якія змогуць засвоіць некаторыя ўдзельнікі ансамбля. У ансамблі, з якім я працую ўсе артысты граюць на народныхдухавых і шумавых інструментах.

*2. Метад стымулявання і матывацыі навучання аб'ядноўвае ў сабе некалькі метадаў:*

а) Метад саўдзелу

Заключаецца ў тым, каб кожнаму дзіцяці знайсці сваё месца ў ансамблі, дазваляе навучэнцам адчуць сябе часткай творчага калектыву, далучыцца да калектыўнай дзейнасці.

Асноўная задача ансамбля – засвоіць беларускі народна-песенны фальклор, таму вакальныя нумары развучваюцца ўсім саставам. Часам адбываецца так, што той ці іншы удзельнік ансамбля дрэнна інтануе, але добра рухаецца і адчувае рытм, ў сувязі з гэтым, найбольш актыўны ўдзел ён прымае ў падтанцоўках і танцавальных нумарах.

У сваю чаргу дзеці, якія добра спяваюць, могуць дрэнна рухаюцца, пагэтаму метад саўдзелу прадугледжвае іх пасільны ўдзел у вакальна-харэаграфічных пастаноўках. У гэтай сувязі вельмі карысна засваенне элементаў народна-бытавога танца, які прасцейшы па выкананні і хутчэй засвойваецца дзецьмі

Да метада саўдзелутаксама адносіцца ўдзел артыстаў ансамбля ў музычным суправаджэнні нумароў, аб якім казалася раней.

б) Метад «музычны тэатр»

Гэта метад індывідуальнага вырашэння ў раскрыцці сцэнічнага мастацкага вобраза (вобразаў жывел, птушак, казачных персанажаў).

Гэты метад накіраваны на тое, каб праявіць магчымасці свайго ўяўлення, фантазіі, паказаць свае выканальніцкія ўменні. Дапамагае дзіцяці зрабіць музыку бачнай, да якой можна «дакрануцца». Ён выкарыстоўваецца пры пастаноўцы фальклорных спектакляў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*3. Гульнявы метад.*

Адзін з найбольш дзейных метадаў у рабоце з дзецьмі. Адна і тая ж гульня можа аднаму дзіцяці дапамагчы ў развіцці звуковыстнага слыху, іншаму - эмацыйнай спагадлівасці, трэцяга – набыць упэўненасць у сваіх сілах, пазітыўную самаацэнку. Гульнявыя моманты з‘яўляюцца ключавымі звёнамі ў працы фальклорнага ансамбля. З музычнага прывітання я пачынаю і заканчваю урок. У час заняткаў праца над вакальнымі творамі мяняецца танцавальнымі практыкаваннямі, рытмічнымі заданнямі з выкарыстоўваннем шумавых інструментаў, практыкаваннямі на развіцце дыхання і артыкуляцыйнага апарату. У працы над дакладнай дыкцыяй выкарыстоўваюцца скарамоўкі і невялікія вершаваныя радкі на кожную літару алфавіта. У малодшай групе з цікавасцю ўспрымаюцца «пальчуковыя» гульні, а таксама беларускія гульні-карагоды, напрыклад, «Грушка», «Падушачка», «Маша».

*4. Рэпрадуктыўны метад.*

Гэта метад замацавання ведаў, пры якім музычны матэрыял праслухоўваюць, засвойваюць, запамінаюць, а самае галоўнае – правільна выконваюць. Складовай часткай гэтага метада з‘яляецца метад практыкавання. Ён уяўляе сабой планамернае паўтарэнне якога-небудзь дзеяння з мэтай правільнага выканання на аснове ўзора. Гэта датычыць практыкаванняў на развіцце пеўчага дыхання, выразнай дыкцыі, народнай манеры спеваў.

*5. Часткова-пошукавы метад.*

Сутнасць гэтага метада ў тым, што дзеці не атрымоўваюць веды ў гатовым выглядзе, а іх трэба знайсці самастойна. Спецыфіка гэтага метада складаецца ў тым, што ў працу ўключаецца ўвесь калектыў. Але ж дзеці не заўсёды могуць вырашыць да канца пастаўленную праблему, па-гэтаму гэты метад атрымаў назву часткова- пошукавы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да часткова-пошукавых метадаў адносяцца:

а) Метад назірання

• інтэрв‘ю або апрос: калі дзеці расказваюць тое, што бачылі і чулі ад сваіх бабуль на конт абрада, дзеяння, свята.

• выезд с групай ці некаторымі ўдзельнікамі ансамбляна святы, каторыя праводзяцца фальклорнымі калектывамі.

б) Метад праектаў (заданні, якія выконваюць дзеці ў дапамогу праекту) - заключаецца ў праяве навучэнцамі сваіх ведаў і ўменняў у самастойнай працы з інфармацыяй. Гэты метад выкарыстоўваецца, калі размова ідзе аб пастаноўцы фальклорнага спектакля, у якім патрабуецца:

• збор матэрыяла, які уключаеў сябе вывучэнне гісторыі абрада, часу і месца яго правядзення;

• выяўленне роляў і характараў галоўных персанажаў;

• пошук паэтычных ці празаічных тэкстаў (тэматычных прыказак, прымавак, загадак);

• пошук ключавых абрадавых дзеянняў, слоў, магічных заклінанняў,

• вывучэнне і стварэнне касцюмаў, масак, атрыбутыкі, дэкарацый.

Як правіла, пастаноўка фальклорнага спектакля — гэта праца ўсяго калектыву.

*6. Метады заахвочвання, падтрымкі, спаборніцтва.*

а)выступы на канцэртах у цэнтры культуры, на гарадскіх конкурсах і фестывалях сольна, а таксама ў саставе ансамбля;

б)ўключэнне найбольш актыўных і яркіх удзельнікаў у склад «журы»пры праглядзе канцэртных нумароў калектыва на сцэне цэнтра культуры;

в)прадастаўленне магчымасціўдзельнікам ансамбля праявіць сябе ў ролі настаўніка на рэпетацыйных занятках;

г) метад спаборніцтва паміж групамі ансамбля або ўнутры групы;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

д)і у выніку –узнагароджванне ў выглядзе розных падарункаў: кубкі, медалі, дыпломы, дыскі, флэшкі, кнігі, альбомы, фотаздымкі.

***7.*** *Метад кантролю і самастойнай работы.*

У наш час усе дзеці, нават малодшыя школьнікі, добра аснашчаны тэхнічнымі сродкамі, якія могуць быць ужыты ў навучанні (смартфоны, планшэты, ноутбукі і г.д.), пагэтаму, усю інфармацыю выкладчык можа дасылаць і перадаваць пры дапамозе гэтых сродкаў (паведамленні, заданні, навіны, інфармацыю, відэа, аудыа, мінусоўкі, тэксты песен). У гэтым і заключаецца самастойная работа дзяцей, калі яны, атрымаўшы новае заданне на свой гаджэт, выконваюць некаторую яго частку ўжо да наступнага ўрока. Акрамя гэтага, вельмі важна падтрымліваць сувязь з бацькамі вучняў, што з'яўляецца залогам ўзаемадапамогі, супрацоўніцтва і паспяховай выхаваўчай дзейнасці ў калектыве.

Важнымі фактарамі актывізацыі і зацікаўленасці дзяцей на занятках па фальклорнаму ансамблю з'яўляецца стварэнне спрыяльнай атмасферы добразычлівасці, даверу, любові, а прымяненне розных метадаў працы і змена адной дзейнасці на іншую дазваляе зрабіць заняткі больш цікавымі і прадуктыўнымі.

---

1. Аляхновіч, А.М. Фальклор у выхаванні школьнікаў: дапаможнік для настаўнікаў музыкі і спеваў, класных кіраўнікоў, выхавацеляў / А.М. Аляхновіч. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2008. — 200с.: ноты.

2. Подласый, И.П. Педагогика: 100 вопросов – 100 ответов: учеб.пособие для вузов/ И.П. Подласый—М. : ВЛАДОС-пресс, 2004. – 365 с.

3. Столяренко, Л.Д., Самыгин, С.И. Педагогика: 100 экзаменационных ответов / Л.Д. Столяренко., С.И. Сымагин. — Экспресс-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

справочник для студентов вузов. — Москва: ИКЦ «МарТ», Ростов н/д: Издательский центр «МарТ», 2003. — 256 с.

4. Чекмарева, Т.С., Мингадеева, А.Ф. Организация работы самодеятельных фольклорных коллективов: методические рекомендации для работников социокультурной сферы / Т.С. Чекмарева., А.Ф. Мингадеева. — Казань : РИС «Республиканский центр развития традиционной культуры», 2013. — 38 с.

**Жевняк В.В.,** студент 212 а группы
Научный руководитель – Кармазина Н.В.

## НАПРАВЛЕНИЯ СОВРЕМЕННОЙ БРИТАНСКОЙ ПОПУЛЯРНОЙ МУЗЫКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Когда речь идет о британской музыке, мгновенно всплывают в памяти легендарные The Beatles, The Rolling Stones, Led Zeppelin, The Who, Pink Floyd, Deep Purple, Iron Maiden и Queen. В настоящее время у английских музыкантов насчитываются миллионы поклонников по всему миру. Британская музыка многогранна и востребована.

В 60-х годах 20-го века британские исполнители перещеголяли американцев в международных и национальных хит-парадах. Это явление получило название «Британское вторжение». На смену музыке 60-х гг. в Великобританию пришел альтернативный рок и инди. Смешение разных стилей, эксперименты с аранжировкой породили множество новых жанров.

Альтернативный рок представляет собой стили рок-музыки, которые противопоставляются традиционным. Из альтернативы развивались брит-поп, гранж, инди-поп, инди-рок и другие жанры. Наиболее известными